# РАЗДЕЛ 3.
# ОСОБЕННОСТИ И ПРОБЛЕМЫ РЕАЛИЗАЦИИ ИННОВАЦИОННЫХ И ТРАДИЦИОННЫХ ТЕХНОЛОГИЙ В ОБРАЗОВАНИИ

УДК 378.147:82 (476)

## ВЫКАРЫСТАННЕ ТЭКСТАЎ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

**А.М. Асіпчук**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт» (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Анатацыя. У артыкуле разглядаюцца прыклады выкарыстання мастацкіх тэкстаў на занятках па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)».
Ключавыя словы: навучальны працэс, мастацкі тэкст, культура маўлення.

## THE USE OF BELLES-LETTRES TEXTS IN THE PROCESS OF STUDYING THE DISCIPLINE «BELARUSIAN LANGUAGE (PROFESSIONAL VOCABULARY)»

**A.M. Asipchuk**
EI «Grodno State Agrarian University» (Belarus, Grodno, 230008, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The article deals with the examples of using belles lettres texts at the classes in the discipline «Belarusian language (professional vocabulary)».
Key words: learning process, literary text, speech culture.

Дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» разлічана на даволі «сціплую» колькасць аўдыторных гадзін, аднак ахоплівае вялікі аб'ём тэарэтычнага і практычнага матэрыялу, які неабходна засвоіць студэнтам. У навучальным працэсе выкладчык шукае найбольш аптымальныя спосабы перадачы ведаў, стараецца творча падысці да рэалізацыі пэўных дыдактычных задач.

Адзначым, што адной з асноўных мэт выкладання дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» у ВНУ з'яўляецца «выхаванне любові і павагі да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуцця самапавагі і



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

самаідэнтыфікацыі, імкненне да далейшага ўзбагачэння беларускай мовы» [1]. На нашу думку, урыўкі з твораў мастацкай літаратуры могуць быць яшчэ і красамоўнай ілюстрацыяй да пэўных раздзелаў вышэйназванага курса. Спынімся на прыкладах.

Так, пры разглядзе тэмы «Мова і соцыум» студэнты знаёмяцца з рознымі функцыямі мовы ў грамадстве. Непасрэднае дачыненне да паэтычнага майстэрства належыць эстэтычнай (або мастацкай) функцыі. Прыкладам можа служыць верш Янкі Купалы «Адцвітанне», у якім адметнае спалучэнне гукаў стварае зрокавы малюнак восеньскай пары, тонка перадае настрой лірычнага героя: *Не шасцяць каласы, Звон не валіцца з касы, Не кладуцца ў стог пласты, Толькі сыплюцца лісты На яловыя кусты, На сухія верасы. Не іскрыцца небазор, Не цвіце трава-чабор, Не цыгліць птушыны стан, Толькі поўзае туман, Вецер б'е ў нямы курган, – Шапаціць імглісты бор* [2]. Або вершаказы Алеся Разанава, дзе талент паэта раскрываецца ў тым ліку і праз гукапіс. Некалькі радкоў з вершаказа «Пчала»: *Пчала нікога не чапае сама, але калі нехта чапае яе альбо той церам, у якім жытлуе яе радзіна, яна не шкадуе жыцця, караючы – і лечачы ад сваволі – крыўдзіцеля, апякаючы яго сваім роспачным пацалункам. Пчала – чаляднiца працы, і на чале летняга дня, ведучы яго за сабою, яна вылятае ў поле, у луг, у сад, цешачы іх сваім прылётам, тым, што пачаўся дзень і што яна, пчала, пачала паломнічаць* [3] і г. д.

У раздзеле «Лексікалогія і лексікаграфія» даецца ўяўленне пра ўсе пласты беларускай лексікі. Разглядаць, напрыклад, устарэлыя словы можна на добра вядомых са школьнага курса творах Уладзіміра Караткевіча. У якасці самастойнай працы мэтазгодна прапанаваць студэнтам знайсці і выпісаць дзесяць гістарызмаў з рамана «Каласы пад сярпом тваім» або з аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» і іншых твораў пісьменніка.

Аказіяналізмы (або аўтарскія наватворы) як разнавіднасць неалагізмаў выдатна праілюстраваны гумарыстычным вершам Леаніда Дранько-Майсюка «Хвалебная песня новасловам»: *Во – гора: інтэрнэт… Заміж такой няўклюдзіны Кажыце: словасвет I ў травені, і ў студзені. Кажыце круглы год, Калі й стамляцца станеце, Не прынтар, а выход – I застанецца ў памяці! I не камп'ютар, не! Асветар – слова лепшае, Бо ў нашай старане Асветай свет завершаны. I хай па-над гарой Мабільнікаў з мабіламі Жыве далькажык мой – Такое слова мілае! Далькажык – даль і каж… Кажы далёка, сонейка, Мяне прасвечвай аж Да самага да донейка!* [4]. Тут аказіяналізмы – гэта не толькі мастацкі сродак перадачы своеасаблівага бачання і адчування свету паэтам, але і адна з крыніц узбагачэння



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

роднай мовы, стылістычныя, семантычныя, словаўтваральныя магчымасці якой шматгранныя.

Да лексікі абмежаванага ўжывання адносяцца дыялекты (народныя гаворкі, што абмяжоўваюцца пэўнай тэрыторыяй). Прыклады такіх слоў знаходзім у хрэстаматыйным рамане Івана Мележа «Людзі на балоце». Ствараючы вобразы палешукоў, пісьменнік выкарыстоўвае элементы заходнепалескага дыялекту, што дазваляе захаваць нацыянальны каларыт, адметнасць вёскі Курані: *мабуць, картопля, шчэ, грэбувала, тутака* і г. д.

Акрамя таго, у гэтым жа раздзеле, калі ўзгадваюцца сінонімы, антонімы, амонімы, паронімы, варта таксама звярнуцца да майстроў слова. Напрыклад, пры тлумачэнні адрознення паміж моўнымі і кантэкстуальнымі антонімамі можна прывесці такія радкі з вершаў Яўгеніі Янішчыц: *У лёгенькім, як вецер, паліто, Нясмелая, нагадваю лілею. З бядой да Вас звярнуцца не пасмею. А з радасцю кароткаю – нашто?* [5]; *Не зараслі быллём гадоў паляны. Жыву, пакуль смуткую і люблю. Прыходзяць людзі – гномы і вулканы – У кожным штосьці таемнае лаўлю* [6]. Першая антанімічная пара *радасць – бяда* прадстаўлена моўнымі антонімамі, другая пара – *гномы – вулканы* – кантэкстуальнымі.

Шматлікімі прыкладамі розных жанраў мастацкай літаратуры ў тэме «Функцыянальныя стылі маўлення» студэнты падмацоўваюць свае адказы пры характарыстыцы мастацкага стылю, які вызначаецца вобразнасцю і багаццем сродкаў моўнай выразнасці. Выкладчык можа прапанаваць студэнтам прадэкламаваць свае любімыя ўрыўкі з паэтычных або празаічных твораў беларускіх аўтараў.

У раздзеле «Культура маўлення» тэксты беларускай літаратуры ілюструюць такія паняцці, як выразнасць, разнастайнасць маўлення. Прыкладамі, безумоўна, паслужаць творы Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна і многіх іншых нашых класікаў.

Такім чынам, на занятках па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» пры вывучэнні пэўных тэм неабходна выкарыстоўваць тэксты з твораў мастацкай літаратуры не толькі з мэтай ілюстрацыі тэарэтычнага матэрыялу, але і для выхавання пачуцця каштоўнасці і прыгажосці роднага слова.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская мова (прафесійная лексіка): тыпавая вучэб. праграма для выш. навуч. устаноў / склад.: М. Р. Прыгодзіч, Г. І. Кулеш, Н. П. Лобань; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча. – Мінск : РІВШ, 2008. – 28 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

2. Купала, Я. Збор твораў: У 7 т. – Т. 2. Вершы. Пераклады (1908 – 1910) / Я. Купала. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. –440 с.
3. Разанаў, А. Танец з вужакамі : Выбранае (Беларуская паэзія XX стагоддзя)/ А. Разанаў. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 462 с.
4. Дранько-Майсюк, Л. Няхай жыццём кіруе смех… / Л. Дранько-Майсюк // Дзеяслоў. 2008. – № 4 (35). – С. 105-106.
5. Янішчыц, Я. Пара любові і жалю / Я. Янішчыц. – Мінск: Маст. літ., 1983. – 223 с.
6. Янішчыц, Я. Каліна зімы / Я. Янішчыц. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 206 с.

УДК 378.147.091:613

## ИННОВАЦИОННЫЕ ТЕХНОЛОГИИ «КЕЙС-СТАДИ» В АГРАРНОМ ОБРАЗОВАНИИ

**О.А. Белоус**
УО «Гродненский государственный аграрный университет» (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Аннотация. Метод «кейс-стади» позволяет взять из практики сельского хозяйства проблему (ситуацию), а студенты в период ее обсуждения разрабатывают модель решения проблемы. При этом их вариантов решения может быть несколько. Преподаватель же поддерживает дебаты, направляет дискуссию, задает вопросы и регистрирует ответы, данные студентами. Таким образом, проводя анализ ситуации, обучающиеся приобретают знания и закрепляют их в ходе обсуждения и принятия решения. Они формируют систему ценностей, необходимую специалистам в сельском хозяйстве. Более того, студенты, предлагая свои решения, защищают свою позицию приводя аргументы в защиту позиции.

Ключевые слова: инновации, технология, «кейс-стади», теория, практика, решение проблем

## INNOVATIVE TECHNOLOGIES «CASE STUDY» IN AGRICULTURAL EDUCATION

**O.A. Belous**
EI «Grodno State Agrarian University» (Belarus, Grodno, 230008, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The case-study method allows taking a problem (situation) from the practice of agriculture, and students, during its discussion, develop a model for solving the problem. However, there may be several possible solutions. The teacher, on the other hand, encourages debate, guides discussion, asks questions, and records responses given by students. Thus, by analyzing the situation, students acquire knowledge and consolidate it in the



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ